Женский подвиг в истории Беларуси. 1917–2017 годы [Электронный ресурс] : электронный сборник материалов Международной научно-практической конференции, 26 октября 2017 г., Витебск. – Режим доступа: http://vlib.by/index.php/ru/zhenskij-podvig

Бараноўскі А. В. *(г. Сянно)*

ЛІДЗІЯ СІРОТКІНА – ГЕРОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПРАЦЫ

Праблемнае поле канферэнцыі досыць разнастайнае. Знайшлося ў ім месца і працоўнаму подзвігу жанчын у гісторыі Беларусі. Біяграфія Лідзіі Сіроткінай, ураджэнкі Сенненскага раёна, з'яўляецца яркім прыкладам жыцця чалавека працы, якое яна прысвяціла сельскай гаспадарцы. Прайшла шлях ад агранома да старшыні вядучага калгаса краіны. Атрымала вышэйшую ступень адзнакі за работу – званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Сіроткіна (Дзягілева) Лідзія Емяльянаўна нарадзілася 19 мая 1932 года ў вёсцы Замошша Сенненскага раёна ў сялянскай сям'і [2]. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны бацьку забралі на фронт. Маці, як магла, дапамагала партызанам. За гэта захопнікі спачатку адабралі ўсю жывёлу, а потым і зусім спалілі дом.

Зімой Ліда з маці жылі ў лазні, летам – у акопе, накрытым галінкамі. Ежы не хапала, таму дзяўчынка хадзіла за малаком у суседнюю вёску да бабулі. Аднойчы на дарозе яе спынілі немцы і, думаючы, што малая нясе ежу партызанам, вырашылі яе расстраляць. Ліда спалохалася і страціла прытомнасць, што яе і выратавала.

Пачатковую школу Ліда скончыла ў роднай вёсцы, сярэднюю адукацыю атрымала ў Машканскай школе. Ёй даводзілася кожны дзень пераадольваць шлях у сем кіламетраў праз лес, каб наведаць школу. У 1957 годзе дзяўчына скончыла агранамічны факультэт Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Падчас вучобы на другім курсе выйшла замуж за Аляксея Сіроткіна [3].

Па размеркаванні Лідзія трапіла ў калгас «Першамайскі» Брагінскага раёна, дзе пачала працаваць галоўным аграномам. Тэрыторыя гаспадаркі была велізарная – толькі раллі налічвалася каля 5 тысяч гектараў. Ужо ў наступным годзе, дзякуючы прыкладзеным намаганням агранома, калгас атрымаў ураджай збожжавых у 12,5 цэнтнера з гектара. Павялічылася ўрадлівасць лёну, гародніны

і бульбы. Сіроткіна атрымала сваю першую ўзнагароду – вялікі сярэбраны медаль ВДНГ СССР, а таксама каштоўны падарунак – швейную машынку. Праз некаторы час яе абралі намеснікам старшыні калгаса [1].

Адправіўшы мужа ў войска і застаўшыся з малалетнім дзіцём, Лідзія Сіроткіна вырашыла вярнуцца на Віцебшчыну, да бацькоў. Тут яна стала кіраўніком аддзялення саўгаса «Старасельскі» Віцебскага раёна. А ўжо праз год жанчыну прызначылі галоўным аграномам калгаса «Перамога» Талачынскага раёна.

За атрыманне высокіх ураджаяў па выніках сёмай пяцігодкі (1959–1965) Сіроткіна ўзнагароджана ордэнам «Знак Пашаны», а па выніках восьмай пяцігодкі (1966–1970) – ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга [4].

Неаднойчы наведваў мясцовую гаспадарку першы сакратар ЦК КПБ Пётр Машэраў. Пётр Міронавіч і Лідзія Емяльянаўна вучыліся ў адной школе, толькі ў розныя гады. Размаўляючы з кіраўніцтвам гаспадаркі, Машэраў не раз заўважаў, што тут ён адпачывае душой. Прыемна было яму бачыць дагледжаныя палі, якія даюць багаты ўраджай лёну і хлеба.

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 12 снежня 1973 года за вялікія поспехі, дасягнутыя ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве, і праяўленую працоўную доблесць у выкананні прынятых абавязацельстваў па павелічэнні вытворчасці і продажу дзяржаве збожжа, бульбы, цукровых буракоў і іншых прадуктаў земляробства, у 1973 годзе Сіроткінай Лідзіі Емяльянаўне прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы [4].

Пасля аб’яднання ў 1977 годзе калгаса «Перамога» з калгасам «Беларусь» Лідзія Емяльянаўна ўзначаліла партыйную арганізацыю і адначасова з’яўлялася намеснікам старшыні калгаса імя Леніна [5].

У 1982 годзе ёй даручылі ўзначаліць калгас імя Дзімітрава Талачынскага раёна. У той час, калі гаспадаркай кіравала Лідзія Сіроткіна, на малочнатаварных фермах былі ўстаноўлены малакаправоды, усе калгасныя дарогі і мехдвары заасфальтавалі, пабудавалі новы жылы пасёлак з медыцынскім пунктам і стаматалагічным кабінетам.

Праца людзей ацэньвалася высокім заработкам і добрымі прэміямі. Чацвёра механізатараў за сваю самаадданую работу былі адзначаны каштоўнымі падарункамі – асабістымі аўтамабілямі. Калі пасля сямі гадоў працы на пенсіі Лідзія Сіроткіна вырашыла сысці, яе не адпусцілі. Яна не магла не паслухаць людзей – засталася яшчэ на год.

З 1995 года Лідзія Емяльянаўна на заслужаным адпачынку. Сіроткіны прадалі дом і набылі ў Мінску кватэру, куды пераехалі на пастаяннае месца жыхарства [6].

Лідзія Сіроткіна выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР, Віцебскага абласнога і Талачынскага раённага Саветаў народных дэпутатаў. Яна аўтар кнігі «Три урожая в год» (1974). Памерла Сіроткіна Лідзія Емяльянаўна 24 чэрвеня 2015 года [4].

Такім чынам, каля сарака гадоў Лідзія Сіроткіна працавала ў сельскай гаспадарцы, трынаццаць з іх – на пасадзе старшыні аднаго з перадавых калгасаў Беларусі – імя Дзімітрава Талачынскага раёна. Сіроткіна атрымала прызнанне сярод людзей. Да яе цягнуліся, ёй давяралі. У сваю чаргу, яна цаніла і падтрымлівала добрасумленнага працаўніка.

ЛІТАРАТУРА

1. **Ее** талант – умение ценить людей [Электронны рэсурс] / сайт раённай газеты «Наша Талачыншчына». – Рэжым доступу: www.natal.by/2012/05/18/ее-талант-—-умение-ценить-людей. – Дата доступу: 18.08.2017.

2. **Памяць**: гісторыка-дакументальная хроніка Сенненскага раёна / уклад. С. В. Шайко ; мастак Э. Э. Жакевіч. – Мінск, 2003. – С. 525.

3. **По** крестьянскому календарю [Электронный ресурс] / сайт газеты «Минский Курьер». – 2008–2017. – Режим доступа: http://mk.by/2014/06/04/104505/ – Дата доступа: 18.08.2017.

4. **Сироткина** Лидия Емельяновна [Электронны рэсурс] / Партал «Герои Страны». – 2000–2017. – Рэжым доступу: http://www.warheroes.ru/hero/hero.asp?Hero_id=21366. – Дата доступу: 18.08.2017.

5. **Скопа, В.** Живые ростки / В. Скопа // Знаменосцы трудовой славы / сост. Г. С. Гужва, В. Г. Скопа, Е. Я. Рыклин. – Минск, 1984. – С. 284–288.

6. **Яны** нарадзіліся на Сенненшчыне : біяграфічны даведнік / склад. А. В. Бараноўскі. – Віцебск : ВДУ імя П. М. Машэрава, 2016. – С. 119–120.